## КРЭЎСКІ ЗАМАК

Замак у вёсцы Крэва Смаргонскага раёна ўзведзены ў нізіне паміж двух высокіх пагоркаў у сутоках ракі Крэвянкі і ручая Шляхцянкі, на нізкім поплаве. Час будаўніцтва замка ў пісьмовых крыніцах дакладна не акрэслены. Паводле меркаванняў розных даследчыкаў, ён вызначаецца даволі шырока — канец XIII — першая палова XIV ст. У адным з летапісаў паведамляецца, што князь Гедымін даў Альгерду ў валоданне «Крэва-замак»[1]. Значыць, замак быў узведзены яшчэ да Альгерда. Літоўскі даследчык С. Абрамаўскас выказаў у сваіх працах думку, што некаторыя асаблівасці будаўнічай тэхнікі, у прыватнасці ўжыванне глінянага раствору і дамешванне ў вапнавую рошчыну тоўчанай цэглы, дазваляюць лічыць, што замак збудаваны на мяжы XIII і XIV стст.[2]. Гэтае меркаванне падмацоўваюць і вынікі нашых даследаванняў.

Планіроўка Крэўскага замка мае шмат агульнага з Лідскім замкам. У плане гэта няправільная трапецыя. З усходу, поўдня і часткова з поўначы і захаду замак засцерагаўся вадою з рэчкі і ручая, што некалі былі перакрытыя плацінамі. Як і ў Лідскім, у Крэўскім замку некалі меліся дзве вежы. Аднак крэўскія вежы былі розных памераў і знаходзіліся не побач, а ў розных месцах. Вялікая Княжацкая вежа (вежа Кейстута) у сячэнні 18,65×17 м — у паўночна-заходнім куце збудавання. Яна выступала за перыметр замкавых муроў, мела не менш як тры паверхі і сутарэнне-турму. Пакоі для князя знаходзіліся на другім паверсе, дзе вокны значна большыя і шырэйшыя. Княжацкія памяшканні, верагодна, былі аздоблены фрэскамі (як у Тракайскім замку). Яшчэ ў мінулым стагоддзі вокнавыя праёмы зберагалі рэшткі тынкоўкі з фрэскавай размалёўкай[3]. Трэці паверх, верагодна, быў абарончы, над ім мог знаходзіцца яшчэ адзін ярус бою. Пра гэта сведчыць тое, што яшчэ ў XIX ст. у тоўшчы вежавага муру зберагаліся рэшткі каменнай лесвіцы, якая вяла некуды наверх. Быў бачны таксама і ўваход у сутарэнне. Вежа пры таўшчыні сценаў 3 м у сваёй аснове мела вышыню больш як 25 м (цяпер вышыня яе рэштак каля 17,5 м).

Паводле пісьмовых крыніц можна меркаваць пра тое, што знаходзілася на асобных паверхах княжацкай вежы. Напрыклад, калі князь Ягайла захапіў у палон князёў Кейстута і Вітаўта, то Кейстут у кайданах быў пасаджаны «во вежу» (значыць, у сутарэнне), а Вітаўт — «в комнату» ці «камору» (княжацкія пакоі), адкуль ён уцёк[4]. Цікавыя звесткі пра ўцёкі Вітаўта дае вядомы гісторык XVI ст. Мацей Стрыйкоўскі. Ён піша, што калі Вітаўт выйшаў з вежы, то да змяркання ён хаваўся на «бланках» (г. зн. на баявой галерэі). Дачакаўшыся, калі варта замкавых брамаў заснула, Вітаўт спусціўся з галерэі, перайшоў па шыю ў вадзе праз замкавы роў (масты, мабыць, былі падняты) і ўцёк на конях, загадзя падрыхтаваных[5].

У 1970 годзе ў выніку правядзення шурфоўкі было ўстаноўлена, што глыбіня падмурка вежы дасягае 3 м. Пад ім знаходзіцца паўметровая падушка з дробнага камення і гліны, якая, у сваю чаргу, ляжыць на дубовых і сасновых лажах і ламаччы. Вышыня паверхаў вежы дасягала 4,8—5 м. Перакрыцці між імі мацаваліся на бэльках сячэннем 30×30 см. Усярэдзіне сцен вежы бачныя каналы ад драўляных брусоў сячэннем 40×40 см, якія ўжывалі як арматуру.

Сутарэнні, відаць, мелі гатычныя скляпенні, аналагічныя скляпенням вежаў Лідскага замка. У 1985 годзе непадалёку вежы знойдзены два кавалкі профільных нервюрных цаглін.

Сцены Крэўскага замка маюць розную даўжыню, а іх таўшчыня ў аснове 2,75 м. Да вышыні 4 м яны зроблены з камянёў, якія клалі ў тэхніцы чыстай каменнай муроўкі. Будаўнікі выкладалі кожны рад з камянёў прыкладна аднолькавых памераў. Ніжнія рады зроблены з валуноў, дыяметр якіх часам набліжаецца да метра. Асноўны масіў муроўкі — з камянёў дыяметрам 20—40 см. Прамежкі паміж валунамі запаўнялі каменнымі клінамі, а потым замазвалі вапнавай рошчынай. Вышэй узроўню каменнай муроўкі ішла цагляная абліцоўка таўшчынёй 65 см з цэглы вялікіх памераў, якую клалі ў тэхніцы балтыйскай або вендскай муроўкі (чаргаванне двух лажкоў і тычка). Часам ужывалі і іншы варыянт балтыйскай муроўкі — чаргаванне трох лажкоў і тычка. Сцены Крэўскага замка дасягалі вышыні 12—13 м. На вышыні прыкладна 10 м па ўсім перыметры сцен ішла баявая галерэя на драўляных брусах. Байніцы знаходзіліся на адлегласці 2,4 м адна ад адной.

У паўночна-ўсходнім куце замкавага двара стаяла яшчэ адна вежа, сячэннем 11×10,65 м. Яна больш позняя, бо прыбудавана да сцен замка і мае іншую глыбіню падмурка. Як і ў Княжацкай, у гэтай вежы былі перакрыцці на бэльках, ад якіх засталіся адтуліны сячэннем 30×30 см. Збудаванне мела не менш як чатыры паверхі.

У паўднёвай сцяне Крэўскага замка, як і ў Лідскім, быў запасны праём-выхад. Цяпер яго няма, але ён добра бачны на чарцяжах, малюнках і фотаздымках XIX — пачатку XX ст. Заходнюю сцяну і сёння праразае яшчэ адзін арачны праём (вышыня каля 2,5 м, шырыня 2,25 м). Асноўны ўваход знаходзіўся, магчыма, у паўночнай сцяне. Ад яго да малой паўднёва-ўсходняй вежы вяла брукоўка шырынёй каля 8 м. Рэшткі яе знайшлі падчас раскопак 1970 г.

У сярэдзіне XIX ст. вакол замка яшчэ зберагаліся рэшткі рова. Даследчыкі адзначалі, што яго шырыня была каля 50 сажняў і ён, мяркуючы па рэльефу мясцовасці, ніколі не быў глыбокі, бо запаўняўся вадою з запруды.

Крэўскі замак — сведка шматлікіх гістарычных падзей. У жніўні 1385 года тут была падпісана унія паміж Вялікім княствам Літоўскім і Польшчай. У 1433 г. падчас міжусобнай вайны паміж Свідрыгайлам і Жыгімонтам замак быў узяты штурмам і пашкоджаны. Але ў хуткім часе яго аднавілі, бо каля 1470 г. ён значыўся адным з шасці муравaных замкаў Вялікага княства Літоўскага.

У 1503—1506 гадах Крэўскі замак значна пашкодзілі перакопскія (крымскія) татары. Неўзабаве, у 1519 годзе, падчас вайны паміж Маскоўскай дзяржавай і Вялікім княствам Літоўскім, ён быў узяты войскамі царскіх ваяводаў. Верагодна, тады ён і страціў сваё абарончае прызначэнне, але людзі жылі на тэрыторыі замка да канца XVIII ст., пра што сведчаць пісьмовыя крыніцы і вынікі археалагічных раскопак 1985 года. Тады было знойдзена шмат цікавых матэрыялаў: зброя, манеты, кераміка, разнастайная кафля, будаўнічыя матэрыялы, вырабы са шкла, металу і косці. Вельмі цікавая кафля XVII ст. з выявай сюжэта «Паляванне на аленя».

Крэўскі замак быў значна пашкоджаны ў гады першай сусветнай вайны, калі праз Крэва на працягу трох гадоў праходзіла лінія фронту. У 1929—1930 гг. рэшткі збудавання былі часткова закансерваваны польскімі рэстаўратарамі.

Праведзеныя ў апошні час гістарычныя даследаванні, археалагічныя раскопкі 1970 і 1985 гг. дазволілі ўвесці ў навуковы ўжытак шэраг новых матэрыялаў, якія сведчаць пра вялікую гістарычна-архітэктурную вартасць помніка. Гэта адзін з першых на тэрыторыі Беларусі замкаў тыпу «кастэль». Мяркуецца, што Крэўскі замак будзе часткова адноўлены і зробіцца адным з найцікавейшых турыстычных аб'ектаў.

**Міхась ТКАЧОЎ,**
**кандыдат гістарычных навук.**
**Алег ТРУСАЎ,**
**кандыдат гістарычных навук.**

[1] Полное собрание русских летописей. Хроника Литовская и Жемойтская. Т. 32. — М., 1978. — С. 41.

[2] Абрамаускас С. Развитие каменного строительства в Литве в XIII—XVI веках. Автореферат кандидатской диссертации. — Каунас, 1965. — С. 8.

[3] Ткачоў М. А. Абарончыя збудаванні заходніх зямель Беларусі XIII—XVIII стст. — Мн., 1978. — С. 35.

[4] Baliński M., Lipiński T. Starożytna Polska. T. 3. — Warszawa, 1946. — S. 235.

[5] Полное собрание русских летописей. Летописи белорусско-литовские. Т. 35. — М., 1980. — С. 63, 156.

[6] Stryjkowski M. O początkach, wywodach, dzielnościach, sprawach rycerskich i domowych sławnego narodu litewskiego, żemojdzkiego i ruskiego... — Warszawa, 1978. — S. 298.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ